# Прэзентацыя кнігі Алега Трусава

7 верасня ў сядзібе ТБМ на Румянцава, 13 у Менску прайшла прэзентацыя 2-га выдання кнігі стар-шыні ТБМ, кандыдата гістарычных навук Алега Трусава “Невядомая нам краіна. Беларусь у яе этнаграфічных межах”.

Гэта дапоўненае перавыданне кнігі, што ўпершыню пабачыла свет у 2009 годзе. Як зразумела з назвы, кніга распавядае пра землі этнічна беларускія, але якія зараз належаць іншым дзяржавам - Польшчы, Літве, Украіне, Латвіі ды Расіі. Першая на-месніца старшыні Таварыства бе-ларускай мовы Алена Анісім зазна-чыла, што гэтае выданне разлічана не толькі на беларусаў. Кніга скала-даецца з дзвюх частак: уласна бела-рускай і з перакладу на англійскую мову (з многімі каментарамі).

- Такім чынам, гэтая кніга можа быць даступная кожнаму гра-мадзяніну планеты. Гэтая кніга - наш выхад на міжнародную арэну не проста як людзей без роду і племені, а як народа з вялікай і багатай гісто-рыяй. І, што не менш важна, са значнай спадчынай.

Аўтар кнігі, старшыня ТБМ Алег Трусаў, зазначыў, што дасле-даванні дазволілі дадаць новыя зве-сткі, якія былі атрыманыя за 5 год з выхаду першага выдання.

- Сюды я ўставіў шмат новых матэрыялаў, знойдзеных за апошнія пяць гадоў, таму гэтая кніжка дапоў-неная. Апошнія факты, якія паспеў дадаць перад самым выхадам, - гэта вясна гэтага года.

Паводле Алега Трусава, у Беларусі ўжо амаль не засталося экзэмпляраў "Невядомай нам кра-іны". Частку накладу раскупілі ўдзе-льнікі З'езду беларусаў свету, част-ку - славісты, што працавалі на сваім XV Міжнародным з’ездзе ў Менску. (Кніга яшчэ ёсць у “Акадэмкнізе”.)

На прэзентацыі выступалі Станіслаў Суднік, які рабіў макет 1-га выдання і з’яўляецца героем раз-дзела пра Цвер; перакладчыца на англійскую мову Наталля Лабанава і кансультант Лявон Баршчэўскі. Дру-гая перакладчыца - англічанка Кэрал Раўз па зразумелых прычынах адсу-тнічала, хаця нядаўна і наведвала Беларусь, каб паглядзець на краіну, над кнігай пра якую ёй давялося працаваць.

Такім чынам сёння на англій-скай мове мы маем дзве грунтоўныя кнігі: “Краіна Беларусь” Уладзіміра Арлова, якая прадстаўляе ў асноўным унутраныя тэрыторыі Беларусі і вось кнігу Алега Трусава, які падаў этніч-ныя беларускія землі, што ў сілу гістарычных і палітычныў умоў на сёння пакуль аказаліся па-за межамі метраполіі - Рэспублікі Беларусь.

Зала была перапоўнена, і выключна прыемным было тое, што большасць людзей была незнаёмая актывістам ТБМ, прыйшлі людзі, якім была цікава менавіта кніга і яе аўтар, а значыць - дзякуючы кнізе А. Тру-сава, беларуская ідэя яшчэ крыху пашырыла межы свайго бытавання.

Наш кар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ